Цэна асобнаго № 15 кап.

Вольная Беларусь

Умовы падпіскі на 1917 год.

За 1 м.	За 2 м.	За 3 м.	За 4 м.	За 5 м.	За 6 м.	За 7 м.	За 8 м.	За 9 м.
1 р.	2 р.	3 р.	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Падпіска прымаецца толькі с 1-го чысла кожнаго месяца.

Перамена адрэсу—50 кап. Пры зьмені адрэсу конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска напісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ні будуць.

На ліставанне, перасылку рукапісаў і іншыя адказы—павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эканамічная і літэратурная.

Год выданьня I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захараўск. 18

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 раз. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы — 1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 31. 1917 г. Чэцвер. Выходзіць двойчы на тыдзень. 23 лістапада 1917 г. № 31.

Беларусы-воіны Заходняга фронту!

№ 4. Выбіраючы да Устаноўчага Сойму падавайце голас за свой сьпісак № 4.

Таварышы і грамадзяне!

Выбары да Устаноўчага Сойму па Міншчыні і Віленшчыні адбудуцца 26, 27, 28 лістапада.

№ 13. Падавайце голас за сьпісак № 13

Беларускай Соцыялістычнай Грамады.

Ворагам.

За што лілася кроў людзкая?
За што гібеў і гінуў люд,
Гібеў набытак ўсяго края
I пакаленняў гінуў труд?
  I бег народ, як ў час пашоркі,
  Закрыўшы вочы, ў Божы сьвет,
  I толькі дым ўздымаўся горкі,
  I крыж адзначываў іх сьлед.
А колькі сьмертак дзетак мілых,
На вашай совесьці ляжыць!
Пануе ціш па іх магілах,
I край разбураны маўчыць.
  I вы цяпер рукамі ката
  Гатовы згоду даравадь?!
  Але ці можна у вас брата
  Скажыце, Каіны, прызнаць?
Вам ні па сілі груз цяжэрны
Вайны, што самі вы ўзьнялі,
Яе пажар і мор бязмерны,
Згінота цяжкая зямлі.
  Ні вы дасьце народам сьвята,
  Ні вам пажар вайны стушыць!
  Прэч вашы рукі,—збойцы, каты,
  Ні вам аб згодзі гаманіць!

2/хп 1916 г. Якуб Колас.

Сьлезы матак.

Без трунаў іх хаваюць.
Крыжоў ім ні стаўляюць.
Крыжоў ім ні стаўляюць...
  Сыноў сьмяротка косіць,
  Матулі ў моц галосяць,
  Матулі ў моц галосяць...
Гніюць сыны у полі.
Мы плачым у нідолі,
Мы плачым у нідолі...
  Цары усе сьмяюцца,
  Руччы крыві ліюцца,
  Руччы крыві ліюцца.

I. Чаляеўскі.

Украінская Рэспубліка і этнографічныя граніцы.

Цэнтральная Украінская Рада, зазначаючы у сваём трэцім унівэрсалі межы аўтаномнай Украіны, паміж іншым, аповешчае, што да тэрыторыі народнае Украінскае рэспублікі належыць Чэрнігаўшчына. Тым часам, такое агуловае прылучэнне Чарнігаўскае зямлі да Украіны выклікае прыкрыя ніпаразуменні. Говорачы аб Таўрыі, унівэрсал падкрэсьлівае, што Таўрыя належыць да тэрыторыі Украіны без Крыму, толькі датычна Чарнігаўскае зямлі ні робіцца жаднаго вылучэння. Такім чынам, само сабою разумеяцца, што унівэрсал уважае усю Чарнігаўшчыну зямлёю украінскаю. З гэткім абмежаваннем этнаграфічных граніц памірыцца ні можна. Паветы Стара́дубскі, Суражскі, Новазыбкаўскі, Мглінскі а так сама Ноўгарадсеверск, Городня і, наогул, уся паўночная столка Чарнігаўшчыны, заселяны беларускім народам, і гэтыя землі па іншы увайсьці у склад аўтаномнай Беларусі. Гэта мы павінны цьвёрда падкрэсьліць, і Вялікая Беларуская Рада павінна нібаўна ужыць усіх заходаў дзеля палагоджэння выкліканаго украінскім унівэрсалам прыкраго ніпаразумення. Нас заўсюды зьвязвало з Украінай асабліваe цёплае брацкае пачуцце, але сьвятая павіннасьць перад родным краем і кроўны інтэрас нашаго народу прымушае нас зауважыць, што дзе-хто з украінскаго грамадзянства сапраўды узіраецца на нашае, адвечна беларускае, сквапным вокам імперыяліста. У беларускай літэратуры яшчэ ні разу ні быў падкрэсьлян той сумны факт с краіны навучнаго і літэратурнаго імпэрыялізму, пра тое, што вядомы на Беларусі украінскі публіцыста, С. Ефрэмоў, у сваёй вельмі цікавай кнізі «Гісторыя Украінскаго пісьменства» усіх даўнейшых беларускіх дзеячоў і пісьменнікоў залічае за украінскіх і, паміж іншым, на вядомы гістарычны беларускі памфлет каштэляна Смаленскаго, Мелешкі, пасылаецца, як на прыклад даўнейшаго украінскаго пісьменства. Мала таго, у п. Ефрэмова неяк выходзе так, што і сам «Літоўскі Статут» напісан украінцамі і па-украінску.

Гэты прыклад сьвёдчыць нам пра тое, што покі мы самі ні падбаем аб сабе, дык ніхто нам ні паспрыяе. Самы шчыры спагадач і прыхільнік перш за ўсё сьцярaжэ сваё і затурбован сабою. Беларусь страціла абаронцаў меня свайго, і на працязі доўгаго часу грабавалі гаспадарку яе. Цяпер на варці інтарэсаў нашаго народу стала Вялікая Рада, і яна павінна пільна сачыць за тым, што робіцца навокала і бараніць маентнасьць і цэльнасьць айчыны свае.

Я. Л-к.

На што нам фэдэрацыя?

I.

У Расійскай дзяржаві жыве шмат усялякіх асобных народаў, як маскалі, або вялікарусы, украінцы, мы,—беларусы, літоўцы, татары, латышы, грузіны і многа другіх. Усе яны маюць сваю ўласную культуру, мову і звычаі. Царская, дэспатычная Расія трымала іх у ніволі, як нівольнікаў у вастрозі. Народы Расіі маўчалі, і мала хто, напрыклад, ведаў, што жывуць на сьвеці беларусы або украінцы. Пад царскім уціскам трудна было даведацца, што гэтыя два народы маюць сваю слаўную гісторыю, літэратуру, мастацтво і толькі выпадкова, дзякуючы гістарычнаму гвалту і гістарычнай ніспраўядлівасьці апынуліся пад уладарствам маскоўскіх цароў. Увесь час маскоўскаго панавання яны жылі маўчалівым, падьярэмным жыццем і ні маглі падаць свайго голасу; бо маскоўскі урад забараніў ім ужываць сваю родную мову. Расійскі урад браў у нашаго народу грошы, і траціў вялікія кошты на тое, каб трымаць яго у нацыянальнай нісьвядомасьці, перарабляючы усіх на адзін маскоўскі кшталт і вядучы так званую абрусіцяльную палітыку. Кожны інтэлігентны беларус з вёскі добра памятае, што вычваралі з яго настаўнікі у школах. Сваім дзіцячым розумам ён думаў, што так яно і трэба, што гэтым выбіваецца з яго «деревенская дурь», і ні ён сам, ні цёмны бацька яго, ні маглі скеміць таго, што гэта робіцца на загаду з Масквы, што гэта прышчапляюць яму яд зьніваґі да свайго, беларускаго, ды перарабляюць на маскоўца. Былі наўмысьля пабудованы сэмінарыі, як-бы дзеля таго, каб гатаваць настаўнікаў для прасьветы народа, а дапраўды-ж—дзеля таго, каб набраць туды селянскіх дзяцей ды нагадаваць з іх служак для свае абрусіцяльнае палітыкі. I мы бачым, што народ наш, ні гледзючы на царскія школы, такі цёмны і ніграматны, як-бы гэтых школаў зроду ў вочы ні бачыў. Тым часам, мэта дасягнута, яд царскаго абрусіцяльства прышчапіўся, і селянство нашае, разам з выхаванаю у царскіх школах інтэлігенцыяю, скрыва глядзіць на сваё роднае. Кожнаму здароваму чалавеку зразумела, што гэта нінармальна і хворавіта, калі чалавек выракаецца свайго роду, але самому хвораму зразумець гэта трудна. Большасьць сучаснаго беларускаго народу атручана гэтым страшным ядам абрусіцяльства і, ні гледзючы на такое моцнае і цалючае лекарство, як наша рэвалюцыя, ачуньвае паволі. Маса й да гэтаго часу ніпрыхільна ставіцца да беларускаго руху, да свайго уласнаго выздараўлення. Тут трэба заўсюды мець на увазі, што гэта людзі хворыя, дзеці заражаныя ядам царату, і дзе-хто, мабыць, сьмяртэльна... Самодзяржавіе ведало, што рабіло; яно умело лгаць і туманіць людзям вочы і, робячы шкоду народу, патрапляло давесьці, што сама шкода пойдзе яму на карысьць. За прыкладамі хадзіць ні трэба, досыць прыпамятаць гарэлачную манаполію. Хто ні чуў, што манаполія на гарэлку заводзіцца дзеля закавання народу ад пьянства? Хітра лгаў царскі урад і многа шкоды нарабіў ён і сваім і чужым. Зараза абрусіцяльства так цашырылася і умоцавалася, што іншы беларус-пеpакінчык, навят добра асьвечны, баіцца беларушчыны, ні раўнуючы, як кручанае стварэнне вады. I страхоцце тут ні ў тым, што ён баіцца,—мала чаго іншы баіцца?—а ў тым, што яго атручаны розум ні можа зразумець, што ён заражаны злачынна, наўмысьля, дзеля таго, каб яго хворае уяўленне палохало яго «польскаю інтрыгай» і «панскімі штукамі». Вот дзе страхоцце! Яго хворае разуменне ні можа сьцяміць таго, што гэтая баязьлівасьць «польскае інтрыгі» зьневажае яго самога, падкрэсьляючы яго кволасьць і ніпашанобнасьць да сябе і свайго чалавечаго гонару.

II.

У дэспатычнай Расіі толькі адзін народ, народ маскоўскі мог вольна развіваць свае прыродныя сілы і здольнасьці. Усе іншыя народы былі скуты кайданамі. Ім было забаронена упраўляць сваімі справамі, вучыцца у школах на сваёй роднай мові і дзе-каму, як ось нам, беларусам, ні дазволялі доўгі час друкаваць кнігі па-беларуску. Гэта так рабілося таму, што уся уласьць у Расіі была ў руках цара, маскоўскіх паноў-земляўласьнікаў, купцоў і фабрыкантаў. Гэтыя людзі дбалі толькі пра багацце свайго краю—Маскоўшчыны, або Вялікарасіі, а на ўсе іншыя землі-акраіны глядзелі, як на свае спажыткоўныя ка-

лёніі, з якіх забіралі усе багацтвы, а ў замену за гэта нічога ні давалі, апрач паліцыі і чужой маскоўскай школы. Праз гэта землі цэнтральнае Расіі (Маскоўшчыны) усё больш і больш багацелі, а нашы, акраіны, бядзелі. Там будаваліся фабрыкі, заводы, адчыняліся вышэйшыя навучныя інстытуцыі, пракладаліся залезныя дарогі. З усіх падаткаў, якія збіраў маскоўскі урад з нашае Беларусі, нават палавіна ні варочалася да дому, а тое, што верталося, ішло на такія установы, каторыя прыносілі нам адну шкоду, як напрыклад: паліцыя, чужая школа, земскія начальнікі, чужыя суды, законы і т. д.

Цяпер зьнішчаны усе гэтыя забароны, і усе так званыя «нідзяржаўныя» народы прыступілі да будавання свайго жыцця, паводле сваіх патрэб, свайго дабрабыту і культурнаго росквіту. Усе яны скідаюць векавыя кайданы і хочуць жыць па сваёй волі на сваёй роднай зямлі. Усе яны дамагаюцца такога дзяржаўнаго ладу, які забезпечыць ім права на вольны росквіт і дасьць змогу стаць гаспадарамі на сваіх уласных нівах. Дзеля гэтаго, усе нацыянальна абуджаныя народы Расіі дамагаюцца перабудовы Расіі ні толькі у дэмакратычную, але яшчэ у ф э д э р а т ы ў н у ю р э с п у б л і к у. А калі маскоўская дэмакратыя, прагнаўшая за дапамогаю нідзяржаўных народаў свайго цара, ды, усеўшыся на яго мейсцы сама, стала перашкаджаць фэдэратыўнаму адбудаванню дзяржавы, дык усьвядамлёныя і арганізаванныя народы Расіі, як Украіна, Сібір, Казацтво і іншыя, парвалі зносіны з ёю і сталі самі заводзіць свае парадкі і будаваць сваё жыццё, маючы на думцы прымусіць да гэтаго і Маскоўшчыну і утварыць потым ядыную фэдэратыўную рэспубліку.

Фэдэратыўная дэмакратычная рэспубліка—гэта добраахвольная суполка вольных дэмакратычных рэспублік, каторыя дзе-якія супольныя дзяржаўныя справы перадаюць супольнаму (цэнтральнаму) ураду. Гэты супольны урад называецца фэдэральным урадам і яго уладзе падлягаюць толькі тыя справы, якія добраахвольна, на моцы уласнай карысьці, перадалі яму асобныя рэспублікі. У ва ўсіх іншых справах кожная такая рэспубліка застаецца саўсім нізалежнаю.

III.

Вось гэтакі дзяржаўны лад павінен запанаваць у Расіі. Тагды Расія стане багатаю, дужаю і культурнаю. Трэба каб усе краі Расіі, заселеныя асобнымі народамі, здатныя палітычнаму самаўладу, або нацыянальна-тэрыторыяльнаму аўтаноміі, і каб вольна утварылі агульна-расійскую фэдэрацыю. Такімі вольнымі рэспублікамі расійскай фэдэрацыі павінны быць: Беларусь, Украіна, Літва, Латвія, Вялікаросія, Сібір, землі Каўказу, Фінляндзія, Эстонія і іншыя. Кожная такая рэспубліка павінна мець сваю уласную дзяржаўную раду, або сойм, і сваіх міністраў, свае законы і свой уласны дзяржаўны лад. Але дзе-якія справы, як напрыклад, абарона дзяржавы і іншае будуць супольныя для усіх, бо гэта будзе карысней для усіх асобных рэспублік. Дзеля гэтаго яны выбіраюць супольны, фэдэральны урад, які і будзе парадкаваць тымі супольнымі справамі. Найважнейшымі заданнямі такога фэдэральнаго ураду павінны быць вышэйшы суд дзеля палагоджэння ніпаразуменняў паміж асобнымі фэдэратыўнымі рэспублікамі і дагляд за тым, каб добра і правідлова забезпечаліся патрэбы нацыянальных меньшасьцяў па усіх дзяржавах фэдэрацыі. Фэдэратыўны дзяржаўны лад забезпечыць вольнае жыццё усім народам і пераменіць вялікую турму народаў на панство свабоды і роўнасьці. А дэмакратычная рэспубліка забезпечыць і кожнаго асобнаго чалавека.

Вось дзеля ўсяго гэтаго нам і патрэбна фэдэратыўная дэмакратычная рэспубліка.

Я. Л.

III Украінскі Унівэрсал.

Украінская Цэнтральная Рада выдала 7 лістапада гэтаго году свой III універсал да украінскаго і другіх народаў на Украіні, у якім гаворыцца, што цяпер, калі у Расійскай рэспубліцы ідзе міжусобная крывавая барацьба, калі у ёй німа Цэнтральнаго Ураду, з шырыцца безуладнасьць і ніпарадкі, якія могуць перакінуцца і на Украіну, калі на ёй ні будзе ядынай і моцнай улады,—Цэнтральная Украінская Рада воляй народу і у імя утварэння новаго уладу абвешчае, што ад гэтаго часу Украіна становіцца У к р а і н с к а й Н а р о д н а й Р э с п у б л і к а й.

«Ні аддзеляючыся ад рэспублікі Расійскай,—гаворыцца ў універсалі:—і шануючы эднасьць яе, мы цьвёрда станем на нашай зямлі, каб нашымі сіламі памагчы усёй Расіі, каб уся Рэспубліка зрабілася фэдэрацыяй роўных і вольных народаў».

Да Устаноўчаго Украінскаго Сойму уся ўлада на Украіні мае належыць Украінскай Цэнтральнай Радзі і ураду, праз яе настаўленаму—Гэнэральнаму Сэкрэтарыяту Украіны.

У зямельнай справі абвешчаецца, што «ад гэтаго часу на тэрыторыі Украінскай народнай рэспублікі істнуючае права ўласнасьці на землі панскія і іншыя, землі ні працоўных гаспадарстваў, маючых сельска-гаспадарскае значэнне, а так само удзельныя, манастырскія, кабінэтскія і царкоўныя землі,—касуецца. Прызнаючы, што землі гэтыя ёсьць ўласнасьць усяго працоўнаго народу і павінны перайсьці да яго без выкупу, Украінская Цэнтральная Рада даручае гэнэральнаму сэкрэтару па зямельным справам нібаўна апрацаваць закон аб тым як парадкаваць тымі землямі зямельным камітэтам, выбраным народам, да Украінскаго Устаноўчаго Сойму».

У работніцкім пытанню: «на тэрыторыі Украінскай народнай рэспублікі уводзіцца скрозь васьмігадзінны дзень працы». Гэнэральному сэкрэтарству працы даручаецца разам с прэдстаўніцтвам ад работнікаў «установіць дзержаўны дагляд над продукцыяй на Украіні, пільнуючы інтэрэсы як Украіны, так і цэлай Расіі».

У справі міру Укр. Цэнтр. Рада «стане цьвёрда, каб мір быў зроблян, як найхутчэй. Дзеля гэтаго яна мае ужыць цьвёрдых заходаў, каб праз Цэнтральны Урад змусіць і супольнікаў і ворагоў нібаўна пачаць мірныя перагаворы». Але да міру «кожын грамадзянін рэспублікі Украінскай разам з грамадзянамі усіх народаў Расійскай рэспублікі павінен моцна стаяць на сваіх пазыцыях як на фронці так і ў тылу».

Сьмертная кара касуецца. Усім затрыманым і засуджоным за палітычныя учынкі абвешчаецца амністію, аб якой выйдзе асобны закон.

Суд павінян быць справядлівым і аднаведным праўнаму разуменню народа.

Павінны быць забезпечаны усе вольнасьці, здабытыя ўсерасійскай рэвалюцыяй і паміж іншымі: «права і спраможнасьць ужывання мейсцовых моваў у зносінах усімі установамі».

Далей гаворыцца, што: «украінскі народ, які сам, доўгія годы, змагаўся за сваю нацыянальную волю і цяпер яе здабыў, будзе бараніць волю і нацыянальнае развіцце усіх народаў на Украіне замешканых, дзеля таго абвешчаем, што за народам: вялікарускаму, жыдоўскаму, польскаму і другім на Украіні прызнаём нацыянальна-пэрсональную аўтаномію, каб забезпечыць ім права і вольнасьць самаупраўлення у справах іх нацыянальнаго жыцця».

У справі харчовай Украінская народная рэспубліка «павінна напружыць усе сілы і ратаваць як сябе, так і фронт і тыя часткі Расіі, якія запатрэбуюць нашае дапамогі.»

У канцы Цэнт. Укр. Рада заклікае усіх грамадзян Украінскай народнай рэспублікі «да рашучаго змагання з усякім безладам і руйнаваннем і да дружнаго вялікаго будавання новых дзяржаўных формаў, якія дадуць вялікай і зьнісіленай рэспубліцы Расійскай здароўе, сілу і новую будучыну.» Апрацовываць гэтыя новыя формы будуць на Украінскім і агульна-расійскім Устаноўчых Соймах. Дзень выбароў да Украінскаго Устаноўчаго Сойму назначаецца на 27-е сьнежня 1917 году, а дзень склікання яго—на 9 студня 1918 году.

Абшар Украінскай народнай рэспублікі універсалам вызначаецца такі: Кіеўшчына, Падолія, Волынь, Чарнігаўшчына, Палтаўшчына, Харкаўшчына, Кацярынаслаўшчына і Таўрыцкі край без Крыму. Вызначэнне граніц тых частак Куршчыны, Холмшчыны і Варонежчыны, і сумежных губэрняў і абласьцяў, якія маюць быць прылучаны да Украіны, будзе зроблено «за згодай арганізаванай волі народаў.»

Кароткі фэльетон.

Байка.

Вярнуўся поп с фэсту. Палічыў грошы, пасілкаваўся ды лёг адпачыць. Ка-

Гусі.

Гусі, гусі,—вырай вольны!
Сумен крык ваш, гусі!
Ляціце вы ў сьвет раздольны
З нашай Белай Русі.
Засумуюць зноў балоты
Без вас, госьці лета;
Занудзяцца, як сіроты
Лозы там да сьвета.
Што ж? ляцеце: для свабоды
Вам і крылля служаць,
Толькі-ж шкода чаго-сь, шкода,—
Па вас далі тужаць,
І сумуе сіротлівы
У чырвань лес адзеты...
Ой, вы, гусі! панясьлі вы
За сабою лето!

* * *

Прайшлі ніваротна дзяньке вясновыя,
Адсьпеваны песьні яе маладыя
І краскі пажоўклі, павялі...
І толькі ўспаміны, як зоркі ў тумані,
Мігнуцца і блісьнуць—і сумна так стане...
Дзе маладасьць? мары?— Прапалі!

Якуб Колас.

СЬВЯТЫ БОЖЭ!..

I.

Дажджлівы, імглісты, з рэзкім паўночным халодным ветрам, спускаўся над убогай вёскаю васенні вечар. Як хаўтурная шырокая чорная апона, распасьцёртая нівіднаю рукою, апускаўся хутка на шэрыя, ніпачэсныя сялібы селян-хлебаробаў, змрок. Яны ахісталіся у яго цёмныя жалобныя цені і недзя зьнікалі. Змрок гусьцеў, глушэў і пахлынаў ўсё у сваёй таёмнай, ніпрагляднай пропасьці.

Сям-там засьвяціўся рад слабых вагänькоў; задрыжэлі, забіліся яны у малюпаціньніх вакенцах, як кволыя, безсільныя думкі іх уласьніцеляў...

II.

Нудна гарыць лучына, уваткнутая у сьветач, у хаці Сымона. Парнае, тухла-сырое паветро, паднятае з вільготнай, ні чым ні прыкрытай зямлі, зьмешанае з едкім дымам лучыны, алавянаю хмарай калышыцца ў гары. Маркотна гарыць вагенёк лучыны; дрыжыць, быццым ахоплены вялікім страхам; патрэсквае, нібы штось сумнае аповедае. Часамі ён разгараецца з усей сілай, як-бы хочучы разагнаць пануючы у хаці алавяны змрок, але, слабы, ізноў ападае, ізноў ціха, маркотна мігаціць і вядзе далей сваю ніскончоную сумную казку.

Разсеўся змрок па куткох хаты ды пільнуе адтуль вачыма упуда, калі згасьне сьвет, каб поўнаўласна запанаваць самому.

III.

Сядзіць Сымон на лаві, каля стала; апусьціў бязўладныя свае рукі у ніз, схіліў на грудзі лахматую голаў, як-бы яна ні магла вытрымаць цяжару нахлынуўшых думак і аслупелымі вачыма глядзеў на сырую чорную зямлю свае хаты, нібы дзівуючыся, што ён жыве на ёй.

У куце, на лаве, засланый абрусам, ляжыць пакойнік.

То цело апошняго Сымонава сынка, што памёр ад «балотнай хваробы.» Безлітасная—гэтая нівядомая балотная хвароба! Чатэры разы прыходзіла яна у хату Сымона і аставіла па сабе чатэры страшэнныя сьляды у яго мужычым сэрцы, чатэры раны, высмаленыя распаленым жалезам,—чатэры Сымонавы сыны яны вынесла на могілкі. Цяпер забрала апошняго, а з ім—і рэшту надзеі на будучыну, рэшту надзеі вызваліцца калі-небудзь з мёртваго бездолля с маладою сілаю. Парвала, безлітасна стаптала вянок тых нібагатых дум, што віў і песьціў у сваёй галаве Сымон. Згасіла той аганёк, што дзесь, у канцы бездарожнай пуціны Сымонаваго жыцця сьвяціўся кволай надзеяй ніакрэсьлянай будучыны, да каторае ён с такою труднасьцю ішоў, падаў ідучы, ды зноў ішоў і ля каторай меў калісьці абаграць сваю пашматаную, старэчую душу...

Усё забрала страшная хвароба! Сядзіць Сымоніха каля свайго сына і, прычытаючы і галосячы, зрошвае яго цело сьлязмі. Ля печы, на прымурку, сядзіць стагодняя бабуся і сухім магільным голасам шапоча малітву: «О-отчэ наш..о-отчэ наш...» і так без канца, як ніпрытомная. Відаць, бабуля ад старасьці забылася маліцца, а можа столькі і знала. Часамі бабуля падымае голаў, каторая дрыжыць, як асінавы ліст, і белымі вачыма блудка водзіць па кутвох хаты, нібы чаго шукаючы, што даўно згубіла.

— «Ні ўзро-ос! ні ад-мя-ніў-уў бацька-вы-ых ру-ук!»—галосіць Сымоніха, а бабуля у тахт яе прычытаннямківае галавою і шапаціць—шапаціць, як сухі пажоўклы ліст, сваю старую малітву.

З мікалаеўскіх інвалідаў царкоўны дзед сядзіць на зэдлі каля лучыны і вугнівым голасам чытае псалтыр.

Сіратліва і бездольна у хаці Сымона. Німа у яго радні, а чужым — што да яго гора, калі гэтае горо зьвязано з «балотнаю хваробаю.» Ні памагаюць Сымонісі кумкі і свахны прычытаць над пакойнікам,—адна яна убіваецца і стогне. Сядзіць Сымон скамянелы: ні плача, ні прычытае над родным дзіцям сваім. Глядзіць толькі на твар змарлаго, на маленькі тварык свайго сына,—пасінеўшы і накрыты жоўцізною. І здаецца яму, што гэта твар ні пакойніка, а яго, Сымонаў, твар, воблік яго душы, яго мізэрнаго чалавечаго «я», разкрыжованаго пакутаю жыцця.

Страшны крык болю вырастае у сэрцы Сымона—рвецца на двор, але, здушаны горам, канае у сударгах на дне яго душы. Рука Божаго гневу павісла над Сымонам і парвала, паблутала шэрыя ніці яго жыцця...

— «За што?!»—крычыць яго сэрцо, і словы праклёнаў небу гараць у распламянёных агнём церпення грудзях.

— «Вялікае горо мае, вялікае! Божэ, Божэ!»—шэпчуць пакорна вусны, а у вочах загараецца страшная злосьць уміраючаго ад ран дзікаго зьвера, і пахлынае у сабе пакорлівасьць і безвольную анямеласьць.

— «Вялікае горо! Вялікая крыўда!.. Крыўда, крыўда!» крычыць і задыхаецца злосьць. Вусны пре-

лі галава дакранулася пухоўкі, пачуўся сьпеў, рыпнулі дзьверы ды увайшоў чорт. Поп крыху спужаўся: першы раз бачыў нічысьціка. Ужо нават руку падняў, каб стварыць крыж—забезпечыць сябе ад спакусы, але цікавасьць перамагла. Чорт жа зрабіў уважны уклон і, грукаючы па падлозі конскімі капытамі, стаў набліжацца. Гэта быў звычайны чорт: рабы твар, чырвоная, як жар, клінам уперад, барада, рыжыя павівастыя валасы і абаранкам хвост.

— «Не, ні зманіш мяне на благое, ні на гэткаго папаў,» надумаў поп.

А чорт наблізіўся саўсім. Із вочы спаткаліся. Чорт глядзеў сьмела, сурьёзна, а ні гэтак, як глядзяць прышоўшы у госьці, або у пазычкі. Стаіць, быццым надумываецца, с чаго пачаць? Колькі часу угледаўся поп з зьдзіўленнем, а потым запытаў:

— «А гдзе баба, ці грошы?»

— «Я кінуў благое,» адказаў чорт с пыхам: «даволі часу валандаўся з гэтым. Цяпер-жа абглядаю людзкое сумленне. Асабліва у тых, хто найбольш мяне лаяў. Чуеш гоман тваіх братоў? Чуеш жаданне беларусаў людзьмі звацца? Чаму?»

— «Пачакай, сьпніся! І так нарэзалі добра сэрцо яны, а ты яшчэ—браты, беларусы... Сьмешкі прышоў строіць, кпінствы? Я—беларус? Ты, мабыць, памыліўся дзьвярыма, да душы кажу! Я-ж навуку здабыў, ад усіх пашану маю, а ты—беларус! Я гаспадар тут, пастыр душ людзкіх, і ні аддам у крыўду людзей маіх. Вон с хаты мае, вон, бо перахрышчу!

...Браточак, даражэнькі! Май ласку, ні балтузь маіх добрых працавітых людзей. Я іх люблю, а ім жадаю дабра, я вяду іх бітым шляхом. Шырока разлегаецца ён да Маскоўшчыны, гдзе усіх нас чакае шчаснае жыццё. Мы добра гэта нарыхтавалі, ён напалоў туды набліжыўся. Давай лепш утворым згоду, зробімся сябрамі: я крыжам, а ты сваёю здольнасьцю—хутка пасунем справу уперад. Разам здолнем усё... Ты круціш галавою? Нават ні слухаеш? Дык вот-жа... у імя Ойца...»

Чорт чхнуў,—а пападзя клікала на гарбату.

Зрэбны.

ПА БЕЛАРУСІ.

[Ад нашых дапісчыкаў]

М-ко Клецк, Мінск. гб. Людзі—зьвяры. Былі выбары ад воласьці у паветовае земства. Гэта старая, тістарычная воласьць. Аб м. Клецку успамінаецца у даўнейшай песьні:

«Із-пад Слуцка, із-пад Клецка
Едзе служба маладзецка...»

Усё насяленне гэтае воласьці мелі права без разбору станаў і нацыяў падаць свае голасы. Падчас выбараў чалавек 300 селян пачалі трэбаваць ад старшыні выбарнае камісіі, С. В—кі, старога культурнаго дзеяча у краю, усімі паважанаго за сваё цьвёрдае, ніпадкупнае сумленне,—каб ён зрабіў выбары асобна ад жыдоў і асобна ад хрысьціян. Ен казаў ніразумным селянам, што гэтаго зрабіць ні можна, бо па закону усе павінны выбіраць разам. Закону нельга зьмяніць, бо тагды выбары скасуюць. Тагды цёмная грамада людзей кінулася на яго, выволакла на двор і начала біць. Прабілі яму галаву і крычалі гэтыя цёмныя людзі-зьверы: «бій, яшчэ кратаецца.» Выпадкам праходзілі два салдаты і, дзякуй ім, адабралі В-ку ад разьюшанаго натоўпу і тым абаронілі яго жыццё.

У с. **Лані**, Слуцкаго павету, пры выбарах у воласьць цёмныя людзі гэтак сама забілі 3-х чалавек ды яшчэ укінулі у рэчку. Забілі Корбута і яго сына студэнта, каторы ратаваў свайго бацьку, і яшчэ аднаго чалавека. Усе яны служылі у князя Радзівілла, займаючы нівялічкія пасады. Калі так будзе далей, то ні водзін сумленны чалавек ні захоча працаваць для вёскі. І так ужо усе уцекаюць,—застаецца адзін, сам сабою, народ, як у лесі. Ніхай мінуе нас чаша гэная!

А. У.

М-ко Горадок, Віленск. гб. Шайка салдатаў учынiла пагром, грабуючы і разьбіваючы крамы. Гаспадар аднае крамы стаў супыняць грабежнікаў, кажучы, што будзе стрэляць у натоўп, калі ні супыніцца пагром. Буяны яго моцна пабілі. Гэтая-ж кампанія грабежнікаў разграміла каля Горадку два маёнткі: Даўцэвічы і Панятоўшчыну. Усе дарагія рэчы ламалі і грабілі; фортэпьян, каштоўныя люстры, маганёвыя шкапы, сталы і камоды, пасекшы, зложылі на дварэ і, абліўшы газаю, падпалілі. Рэзалі скаціну, авечак, свінняў, гусі і курэй... І ніхто ні мог уняць гэтых разбойнікаў!

Л—к.

г. Несьвіж, Мінск. гб. Нацыянальная сьведомасьць сярод выхаванцаў настаўніцкіх сэмінарыяў расьце і пашыраецца. Можна спадзявацца, што цераз год-два шчырыя дзеці зямлі Беларускай запануюць у краю, а ўсе адступнікі і маскоўскія прыслужнікі пойдуць шукаць сабе хлеба туды, дзе гэта зручней. Рэнегатам і зраднікам німа мейсца на вольнай зямлі Беларускай!

Выхаванцы Нясьвіжскае настаўніцкай сэмінарыі на сабранні 15-го лістападу ухвалілі гэтакую пастанову аб нацыянальнай справі:

«Выслухаўшы даклады Бандацкаго і Міцкевіча сабранне пастановіло: дзеля паднясця нацыянальнаго самаусьведамлення роднаго беларускаго народу, дзеля прабуджэння яго ад векавога сну і дзеля пашырэння роднае культуры—ніадкладна патрэбна арганізаваць пры сэмінарыі гурток, каторы мэтаю сваёю паставіць: 1) азнаемленне вучняў з гістарычным жыццем Беларусі, яе культурай—даўнейшай і ціперашняй, і палітычным становішчам у сучасны мамэнт; 2) паднясце нацыянальнай сьведомасьці сярод беларускаго селянства; 3) лучэнне усіх вучняў—беларусаў сярэдніх школ пад сьцягам: «Ніхай жыве вольная Беларусь!»—Гурток будзе звацца: «Беларускае таварыство Прас вета.» Пры магчымасьці, будзе выдавацца месячнік. У склад гуртка на першых часах увайшло 77 сябрукоў. Прэзыдыум складаецца с 5-і чалавек. За старшыню выбран Андрэй Бандацкі, яго таварышам—Пятрусь Хьвашчынскі, за сэкрэтароў—Міх. Міцкевіч, Міх. Гулякевіч, скарбнікам—Рыгор Розум. Старшыною сабрання быў А. Бандацкі, яго таварышамі—М. Міцкевіч і Р. Розум, сэкрэтарамі—Хвашчынскі і І. Кулеш.»

Ад гуртка «Беларускае Таварыство Прасьвета» рэдакцыя нашае газэты адтрымала гэтакае прывітанне: «Закладаючы гурток «Беларускае Таварыство Прасьвета», мы жычым, каб і нашае працы капля увайшла у супольную работу на карысьць роднаго краю, каб ні сьмеяліся з нас суседзі, гледзючы, як сьпяць людзі, калі ужо сонцо узышло. Шлём шчырае прывітанне «Вольнай Беларусі»—адынай газэці, гдзе відаць праўдзівае шанованне беларуса і гдзе пяюць свае песьні нашыя родныя паэты. Ніхай жыве і расьце «Вольная Беларусь»! Ніхай на добрую карысьць дзеля народу шле яна праменні сьвету у густую іщчэ цемру!.. Беларускае Т-ство Прасьвета» пры Нясьвіжскай настаўніцкай сэмінарыі.

Голас селяніна. Селянін вёскі Цесовы хут. в. Забрадкі, Слуцкаго павету, Хвёдар Міронаў, прыслаў на імя рэдактара ліста, каторы друкуем у яго аўтэнтычнасьці, выправіўшы правопіс: «Вам, ягомасьць, ад шчыраго сэрца зычу спаўнення вашаго жадання на прасьвету Беларускаго народу. Дай Божухна вялікую моц нашым працоўнікам, тым, хто забачыў нашую нішчасную долю гаротнаго беларуса, каторую ён нёс ад старога правіцяльства пад кірункам Мікалая другога. Але цяпер мы, беларусы, могам сьмела падняць галаву і сказаць усяму міру і на увесь сьвет, што жыве беларус, і што яго ніхто ні мог разбоўтаць ні у якой людзкай вадзе і што рэжыма цароў рускіх ні магла выцярабіць з Беларусіі ні мовы, ні іх паведэнцыяў і нашыя інстытуты асталіся у вёсках ні кім ні зачэпляны і наша мова ні пакалечана. Мы, беларусы, жычым таму дзеячу вялікаго шчасьця і харошае долі, каторы будзе стаяць за нашую сьвятую Беларусь і за працавітаго гаротніка-беларуса і будзем клясьці век-на-векі таго, хто скажа, што німа беларуса.

Выбары да Сойму. З Оршы на Магілёўшчыні паведамляюць, што, дзякуючы цяперашнім падзеям, выбары да Устаноўчага Сойму ні могуць адбыцца у прызначаючы тэрмін.

Мінская камісія па справам выбароў ухваліла адсунуць выбары у Сойм на 2 нядзелі. Такім чынам, выбары па гор. Мінску павінны будуць адбывацца 26, 27 і 28 лістапада.

Нішчэнне лесу. Прыезджаючыя у Магілёў з рожных паветаў Магілёўшчыны разказваюць, што амаль ні ўсюды селяне сякуць панскія і скарбовыя лясэ. Лес сячэцца бяз жаднай сыстэмы — і будовяльны і дровяны. Зьявішчо гэта наття сумнае, бо робіць шкоду самым-жа парубшчыкам, каторыя ні ведаюць, што

сяць благання, а праклёны рвуць душу і давюць горло.

Як завіруха у зімнюю поўнач, вые, плача і бьецца Сымоніха. Шапоціць бабуля сваю малітву; як капля са стрэхі у дажджлівы дзень, падаюць у ціш адны і тыя-ж словы, і, як уваскросшыя безпрытульныя душы, блудзяць яны у старой скрыўлянай хаціві. Царкоўны дзед выгнявіць і туга цягне словы с псалтару, нібы яны там прыросьлі. І здаецца, німа гэтаму сьпеву, што адклікаецца ужо магілаю, ні пачатку, ні канца...

IV.

Заскрыпела закрутка у вушаку; заенчылі дзьверы і са скрыпам адчыніліся. У хату увайшоў тоўсты, с тлустым, адутлаватым, тупым тварам, поп, а за ім худы, рыжы, жаўжыкаваты дзяк. Увайшоўшы, поп пацягнуў носам паветро, зморшчыўся, паглядзеў на гаспадара, на пакойніка і, моўчкі, з якоюсь злосьцю, стаў узьдзеваць рызу. Дзяк запаліў сернік і, скоса паглядаючы то на сідзячаго і нірухомаго гаспадара, то на попа, пачаў старанна разпальваць у лятарні сьвечку. Цэркоўны дзед змоўк, пераксьціўся, спаважна пацалаваў псалтыр, ды, згарнуўшы яго, засунуў за-пазуху; потым падышоў к пакойніку і узяў вялікі дзераўляны крыж, што стаяў у галовах пакойніка; адышоў с крыжам да дзьвярэй і, як салдат на варці, стаў з ім, выцягнуўшыся у струнку.

— «Бяры дамавіну!»—зьвярнуўся поп да гаспадара і, з адцышкай запеяўшы, пайшоў на двор. Наперад яму забегаючы, пасьпешыў і дзячок з лятарняй.

Пайшлі... У перадзі ёшоў с крыжам дзед і сваімі салдацкімі чобатамі адважна мерыў у цемнаце лужыны вуліцы. Хрыпатым, адрывістым, глухім голасам падцягаў ён за дзяком словы сьвятой песьні; часта прарываў і моцна кашляў. За ім йшоў дзяк і тонкім кабечым голасам сьпеваючы, услужліва асьвечаў дарогу попу. З-заду за усімі, акружоны змрокам, йшоў Сымон і нёс на плячы дамавінку с сынам.

За імі у цемры ночы асталася крывая хаціна, што глядзела у сьлед ім сваімі малымі прысьлепаватымі ваконцамі, а на парозі яе, упаўшы на калені, з заломанымі і выцягнутымі уперад рукамі, абамлела ад ўсяго слабая і хворая Сымоніха. Вецяр з дажджом хлістаў ёй у твар, рваў распушчаныя валасы, але яна была уся скамянелая і нірухомая. Дзікі яе узрок зьліўся з цемраю ночы і нік дзесь у далі. Чорны імглісты змрок палогам зьвіс пад зямлёю і крапіў дробнымі, частымі сьлязьмі. Ішла, чуць асьвечаная, хаўтурная працэсія, змрок поўз за ёю і ні пераставаў плакаць. Здавалося, што там, у чорнуй высі, нехта ажаліўся над горам чалавека і праліваў сьлёзы.

Падышлі к могілкам.

Як-бы з упуду, дзесь глуха прастагнаў звон ды змоўк. Падышлі проста к ямі. Сымон паставіў дамавінку на кучу сьвежаго пяску, скраю ямы, і стаў каля дамавіны на калені. Хутка, пераганяючы адзін другога, запеялі поп з дзяком.

— «Ве-ечна-ая па-мяць! Вечн-... памяць!» адрываючы скончылі і змоўклі. Пачалі, паглядзелі на Сымона, што як аблуканы усё стаяў на каленях і услупіўся ўзрокам у дамавіну. і пашлі.

За імі паплёўся і дзед...

V.

Моўчкі бярэ Сымон і здымае века з дамавіны. Сумны бляск да ліхтарні кволаю хваляй расплываецца і спадае на магільныя крыжы, на галіны дрэў, што пазвісалі пад ямаю, на жоўты твар пакойніка і на лахматую, пакудлачаную галаву Сымона. Цяжкі змрок то падкрадваецца і заглядае у твар пакойніка, то, адагнаны сьвятлом, крыецца між трухлявых крыжоў і голых кустоў чаромхі, то падымаецца у вяршыны дрэў і адтуль ціха, злосна сьмяецца, Жалобна шумяць над дамавінай і над галавою Сымона кароны дрэў, як-бы с сірочым плачам пяюць жалобную песьню хаўтур, і сыплюцца буйныя сьлёзы.

Закінуў Сымон назад сваю лахматую галаву, выцягнуў уперад, ўгору, сухія мазольныя рукі; уставіў у чорную высь свой разпаляны болям, дзікі узрок і —запеяў... Запеяў страшным нічалавечым голасам. Здавалося, што гэта была ні чалавечая песьня, а галоднага, раняного воўка, канаючаго з голаду і з болю, качанеючаго на марозі адзінока, на безмежнай пустой сьнягавуй раўніні. Яго сударгі агоніі канапвя, яго ніўламаны страх перад таёмнаю сілай быцця, яго жаданні жыць, сьвету, корму, цяпла; яго боль, мукі, яго скрытыя сьлёзы,—усё гэта вылілася у песьні, у страшнуй песьні-жальбе і праклёну чалавеказьвера...

— «Сьвя-а-а-ты-ы Бо-о-о-жа!»—вырываўся з вуснаў Сымона сьпеў-роў і глуха, маркотна разходзіўся па могілках. Ні канчаліся словы крыку-стогну, як у грудзях радзіліся ужо другія, трэйція... сотыя і усе рваліся у курчах сударгаў, з енкам, з нічалавечымі мукамі, с агромністай скаргай сьлёз к цёмнаму небу...

Адчынялася у душы Сымона таемніца, дзе многа лет хаваліся мукі быцця, і паллылі яны цяпер адтуль вялізорнай, усе пахлынаючай хваляй. Роў чалавек-зьвер, ашалелы з свайго страшэннаго гора. Роў судным голасам вяковых ніспраўядлівых цярпенняў, вяковых нізлічоных крыўдаў, вяковага безплоднаго змагання усяго свайго племяні...

— «Сьвят! Сьвят!! Сьвят!!!»—ужо ні словы, а штось дзікае, бязмерна страшнае, у найвысшых чалавечых муках ірвалося з грудзей Сымона і жудасна разплывалося у корчах і згібах самабічавання, паміж магілаў і крыжоў, у сырой цемяні ночы і шалёна кружылося над маленькай простай дамавінкай. Цягнуліся мазольныя рукі к чорнаму небу і то падалі па дамавіну, то ізноў цягнуліся, як-бы адтуль кагось выклікалі на апошні суд. Адзін аблуканы чалавечы ўзрок ні слабеў і разам с словамі рваўся кудысь... Падаў увесь чалавек ніцма на пясок ды роў і грыз зямлю. Білася галава аб верх дамавіны...

А чорная поч усё сьмялей і сьмялей падыходзіла к чалавеку, і усё больш і больш агортала яго сваёю хаўтурнаю апонаю і, слухаючы яго жальбы, злосна сьмеялася з яго безсілля...

Фабіян Шантыр.

АД РЭДАКЦЫІ.

Прыпамінаем нашым паважаным падпішчыкам і арганізацыям, каб адаслалі грошы, належныя за падпіску газэты «Вольная Беларусь».

робяць. Але гэткія скуткініуцтва і народнае цемры, перайшоўшыя да нас у спадшчыну ад старога рэжыму. Гэтая-ж народная цемра стварае спрыяючы грунт дзеля пашырэння ціперашняе руйнуючай анархіі.

Апошнія навіны.

Крызіс у арміі. С пэўнасьцю паведамляюць, што ген. Каледзін адклікае казакоў з усіх фронтаў. Казакі ахвотна выпаўняюць наказы свайго атамана. 4-го лістапада вышлі с Пскова апошнія часткі казакоў.

Украінская Рада наказала украінцам-салдатам пакінуць паўночны фронт і варочацца на Украіну. На паўночным фронці украінцаў больш за 36000.

Дэкрэт аб нацыяналізацыі друкарняў і паперы. Новы Урад у Смольным інстытуці гатуе новыя дэкрэты: 1) дэкрэт аб нацыяналізацыі друкарняў і паперы. Усе друкарні будуць абвешчаны дзяржаўнаю уласнасьцю. Права карыстацца друкарням дзеля выдання газэт будзе надано толькі партыям і вялікім арганізацыям. Друкарні і папера будуць дзяліцца памяркоўна ліку сябрукоў партыі, або арганізацыі; 2) дэкрэт на манаполлю абвестак. Будзе забаронена друкаваць абвесткі у другіх газэтах, апроч урадаваго органу, каторы будзе звацца «Вѣстникъ народнаго правительства». Прыбытак ад абвестак будзе наступаць у казну.

Таемныя умовы 5-га лістапада. Троцкі у Радзі работніцкіх і салдацкіх дэпутаў заявіў, што быўшы таварыш міністра заграничных спраў Нератоў перадаў усе важнейшыя таемныя умовы паміж хаўрусьнікаў англійскаму паслу, але англійскі пасол адказаў, што нічога гэтаго ні было, што ён таёмных дакумантаў на перахаванне ад Нератова ні прымаў.

Палестына —жыдом. Мінскі районны сіоніцкі камітэт адтрымаў тэрміновую тэлеграму с Петрограду ад Цэнтральнаго Сіоніцкаго камітэту гэтакаго зьместу:

«Лёнданскія корэспандэнты сіоніцкіх газэтаў тэлеграфовалі аб апублікаванні Ангельскім правіцельством дэкляраціі аб аддачы жыдом Палестыны. Дэклярацыя зьяўляецца скуткам палітычнай чыннасьці нашых прэдстаўнікоў. Намі адтрыманы весткі ад ангельскаго пасольства, афіцыяльно запэўняючыя гэтую дэклярацыю. Адночасьне апублікована паведамленне аб аккупацыі паўднёвае Палестыны разам з Яффаю. Чакаем афіцыяльнаго тэксту дэкляраціі.»

Выход нісоцыялістычных газэт. 8-го лістападу вышлі посьля двухтыднёвага перапынку усе буржуазныя газэты.

Выбары патрыарха. Цэркоўны сабор выбраў усерасійскім патрыархом москоўскаго мітропаліта Тіхона.

Адстрочка выбароў да Устаноўчаго Сойму. С Петрограду паведомляюць, што адбылася парада столічнае камісіі па справі выбараў да Устаноўчаго Сойму. Камісія прызнала, што выборы, назначанныя на 12-го лістапада, адбыцца ні могуць. Камісія назначыла новы тэрмін— 19 лістапада.

Чуткі з заграніцы. Сярод румынскаго грамадзянства вышэйшых станаў цапыраюцца думкі на карысьць утварэния саюзу з Няметчынаю і Аўстрыяю. Гэтак сама ходзяць чуткі, што Румынія вядзе астатнімі днямі перагаворы з Вільгельмам. Вільгэльм запрапанаваў румынскому каролю Карлу зрачціся трону на карысьць яго брата і перайці з балгарскім і турэцкім войскам, за дапамогаю Аўстрыі і Гэрманіі, у наступленне на Бэсарабію і Адэсу.

Харчовая руіна. Народны камісар харчовых спраў, Тэодоровіч, у размові з журналістам сказаў: «Становішчо с харчамі катастрафічнае. Запасы выходзяць, падвозу ніякога, і н ма сіл справіцца с транспортам. Залезніцы ні могуць здаволіць патрэб транспорту. Многа дарог разобрано, рух прыпыніўся. На шмат якіх дарогах саўсім німа рухомаго складу, а той што есьць, заняты без усякаго ладу эшэлонамі войска. На фронці харчовая справа стаіць настолькі востра, што голад ў найблізшым часі німінуючы. Асабліве пагано стаіць справа на паўночным фронці, а так сама на румынскім, куды падвоз апошнімі днямі саусім спыніўся.

Перадача украінскаго унівэрсалу па радзіатэлеграфу. Унівэрсал Украін. Цэнтр. Рады пра устаноўленне Украінскае Народнае Рэспублікі перадан па радзіатэлеграфу. Такім чынам, унівэрсал ведомы ужо па ўсіх мейсцах, дзе маецца радзіатэлеграфныя станцыі.

Сьвято абвешчэння Украінскае Рэспублікі. 9-го лістападу у Кіеві на Софійскум пляцу адбылося сьвято абвешчэння Украінскае Народнае рэспублікі. Былі чужастороннія госьці: французы, італійцы, румыны, бельгійцы. Старшыня Цэнтральнай Рады М. Грушэўскі абыходзіў войско, што згуртавалося увакруг помніка Багдану Хмэльніцкаму. Воядтво вітало М. Грушэўскаго радасными поклікамі. Калі зышліся усе генэральныя сэкрэтары, у Софійскай катэдры зазвонілі у ва ўсе звонэ, выйшло с харонгамі духавенство, сярод якога было чатэры архірэі у золатых мітрах, с прэсьвяшчэнным Алексіем на чале. Проф. Грушэўскі сказаў кароціньную прамову, посьля якої генэральны сэкрэтар харчовых спраў М. Ковалеўскі прачытаў Унівэрсал Цэнтральнай Рады, якім абвешчалася Украінская Народная Рэспубліка. Дзесяць тысяч войска і грамадзян слухалі, скінуўшы шапкі. Толькі словы Унівэрсалу далёка чуліся, ды ціхі вэтрык лапацеў соткамі штандароў-жоўтаблокітных, чырвоных,—якім скрозь укветчан быў пляц. Колькі разаў падчас чытання Унівэрсалу з тысяч грудзей вырывалося грымавое «слава!».

— Грамадзяне Украінцы!—зьвярнуўся М. Грушэўскі да усіх, як быў прачытан Унівэрсал,—вы выслухалі слово Цэнтральнае Рады. Ніхай жа жыве Украінская Народная Рэспубліка у фэдэрацыйнай рэспубліцы Расіі!

У адказ яму зноў грымела «слава!». Сонцо грало на золатых мітрах архірэяў і шаблях войска. Пекную прамову сказаў прэасьв. Алексій. Служылі малебін. Прачыталі украінскаю моваю эвангэлію, праспевалі многалеццо украінск. войску, Рэспубліцы, Радзі, Гэнэр. Сэкрэтарыяту. Пад канец урачыстасьці пачаў ісці сьнег, перши сьнег у гэтую восень у Кіеві.

— Зіма ідзе.—сказаў хтось с грамадзян.

— Хвала Богу, што управіліся дабудаваць хату,—адказаў яму другі.

Пра мір. У друку зьявіліся весткі, што кайзэр Вільгэлям, калі яму Троцкі запрапанаваў мір, адказаў: згадзіцца на мір магутолькі або с царскаю дзінасьціяю, або з Устаноўчым Соймам.

Галова Рады Народных Камісароў, Ленін, перадаў па радзіатэлеграфу усяму войску, каб салдаты у кожным полку абралі прэдстаўнікоў ды праз іх самі пачыналі-б міравыя перагаворы з ворагам. Посьля гэтаго даручано было верхоўнаму Глаўнакамандуючаму ген. Духовіну гэтак сама пачаць перагаворы пра мір, але ген. Духонін адмовіўся, сказаўшы, што ён ні можа умешвацца у палітычныя справы і с прычыны німажлівасьці праводзіць міровыя перагаворы цераз салдацкія масы. Тагды Духоніну было перазказано ад імені Рады Народных Камісароў, што яго усуваюць с пасады глаўнокамандуючаго і на яго мейсцо прызначаецца прапоршчык Крыленко, катораму генэрал Духонін парадасьць дзела. Да прыезду Крыленка у стаўку, Духовіну наказано пад пагрозаю сьмертнае кары выпаўняць тэхнічную справу камандавання войскам на фронці.

Што робіцца ў Расіі. «Дѣло Народа» паведамляе: «Падаём ведамасьці, якія мы прыватна адтрымалі пра крывавыя падзеі большэвікоў на правінцыі. Казань— руйнавалі артылерысты. Стралялі з вялікіх гармат. У яком становішчу зараз горад і яго населенне—ніведома. Падробязгі злачыцнаго безумства раскрыюцца перад намі толькі тады, калі краіна ні будзе разбіта на колькі цалкам адрэзаных аднае ад аднае краін і горадоў, т.-е. посьля вызволення рэспублікі ад сваволства Леніна і Троцкаго. Сімбірск. Горад у руках большэвікоў. Усе гандлёвыя інстытуцыі, кафэ, пекарні, навят цырульні разруйнованы. У Вятцы—спакойна. Улада ў руках губ. земскагв сабрання.

Украінскае духавенство. Гурток украінскаго духавенства 12 лістапада склікаў устаноўчае сабранне Брацтва адраджэння праваслаўнае цэркві на Украіні.

Павіншаванне украінцаў ад грузінаў. Грузіны-грамадзяне места Кіева, без рожніцы партыяў і напрамкаў, выслаўляюць сваю шчырую і безмежную уцеху адрадзонай Украіні па здарэнню абвешчэння Народнае Украінскае Рэспублікі і урочысто кажуць:—Слава Украіні, слава украінскай дэмакратыі! Мы пэўны, што падняты вамі штандар—сымбол перамогі фэдэрацыі—ні застанецца адзінокім і што іншыя народы гэтак сама сьвядома і горда паднімуць штандары фэдэрацыі. Ніхай жыве фэдэратыўная рэспубліка!

Пра Керэнскаго. А. Керэнскі прыслаў на імя міністраў-соцыялістаў заяву пра тое, што ён зракаецца быць старшынёю міністраў. Міністры прынялі адстаўку і ухвалілі паведаміць сэнат для распублікавання.

У Аўстрыяцкім парлямэнці. 9 ліст пада ў Аўстрыяцкім парлямэнці паўсталі гарачыя спрэчкі па справам польскім і чэшскім. Украінскі дэпутат Петрусевіч называў праэкт гр Чэрніна пра будучае становішчо Польшчы «злочыным проці волі і права народаў» і выславіў надзею, што на конгрэсі пры абгаварэнні умоў міру будуць прэдстаўнікі іншых дзяржаваў, а ні толькі Аўстрыі і Гэрманіі. Славінец Корошыч даводзіў, што прылучэнне Галічыны да Польшчы яшчэ пабольшыць цікар нямецкаго ярма над славянамі у Аўстрыі.

Выбары да Устаноўчаго Сойму у Петраградзі. На выбарах да Устаноуч. Сойму па Петраграду падалі свой голас 927,354 чалав. Большэвікі адтрымалі 7 мейсц. Па іх сьпіску прайшлі: Ленін, Зіновьеў, Троцкі, Каменеў, Колантай, Сталін і Джугашвілі. Кадэты правелі 4-х дэпутатаў: Мілюкова, Вінавера, Кутлера і Родзічэва. Соцыялісты-рэвалюцыянеры 2-х: Чернова і Камкова. Рэшта спіскаў засталося без мейсц.

У Смаленску. На выбарах да Сойму большасьць голасоў—11.339 адтрымалі большэвікі, за імі ідуць кадэты, потым с.-р. і с.-д. меньшевікі. Нац.-соц. блок адтрымаў усяго 691 голас і такім чынам свайго дэпутата ад Смоленску мець ні будзе.

Вялікарускі рух. З Севастополя паведамляюць, што пачаўся нацыянальны вялікарускі рух сярод матросаў флоту. Рост нацыянальнаго руху сярод іншых народаў Расіі абуджае нацыянальную сьвядомасьць і у вялікарусаў. Даўно пара!

Працяг паэмы Я. Коласа «Сымон Музыка» будзе друкавацца пасьля Новаго Году.

Рэдактар Я. Лёсік.

Выдавец «Т-во Беларускай Культуры»

Друкарня Н. М. Нахумова (старэйшаго)